## ТЭАРЭТЫЧНАЯ СПАДЧЫНА ЛЬВА САПЕГІ І БЕЛАРУСКАЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АДРАДЖЭННЕ КАНЦА XIX - ПАЧАТКУ XX ст. (пастаноўка праблемы)

**В. Ф. Шалькевіч**

У 1569 г. у выніку Люблінскай уніі ВКЛ і Польскае каралеўства аб'ядналіся ў адну дзяржаву – Рэч Паспалітую (Rzeczpospolita у перакладзе з польскай мовы азначае «рэспубліка»). Вышэйшымі органамі дзяржаўнай улады былі кароль і сойм. Кароль выбіраўся соймам. Выбары праходзілі ў тры этапы. Папярэднічаў выбарам канвакацыйны сойм. Затым збіраўся элекцыйны сойм і, нарэшце, каранацыйны.

На перыяд бескаралеўя, якое наступала ў выніку смерці караля альбо адмаўлення яго ад трону, функцыі караля выконваў *interrex* («паміж-кароль») – галава рымска-каталіцкай царквы Рэчы Паспалітай, прымас Польшчы (*prymas* – першы), арцыбіскуп Гнезненскі. Ён склікаў канвакацыйны сойм, задачай якога было падтрыманне законнасці да абрання новага караля, вызначэнне тэрміна і падрыхтоўка выбараў новага караля, складанне *pakta konventa*. *Pakta konventa* (другое напісанне *pacta conventa*) – гэта лацінскія словы (*paktum* – дагавор, умова, *konventus* – дамаўленне), якія ў перакладзе на беларускую мову азначаюць «узгодненая дамова». Гэта дамова паміж шляхтай і магнатамі, з аднаго боку, і электам (г. зн. прэтэндэнтам на каралеўскі трон), з другога, якая змяшчала будучыя правы і абавязкі электа, пасля таго як ён стане каралём. Падпісанне *pakta konventa* электам было ўмовай абрання на каралеўскі трон.

Першы раз *pakta konventa* была складзена і падпісана ў 1573 г. ў час выбараў на трон Рэчы Паспалітай французскага прынца Генрыха Валуа (1551–1589), у сувязі з чым яна атрымала назву *Генрыкавых артыкулаў*. У

1587 г. ў час абрання Жыгімонта III Вазы Генрыхавы артыкулы былі дапоўнены новымі палажэннямі. *Pakta konventa* рабіла караля амаль цалкам залежным ад выбаршчыкаў і аслабляла каралеўскую ўладу.

Пасля падпісання *pakta konventa* надыходзіла чарга элекцыйнага сойма. Ён заўсёды праходзіў у Варшаве, дакладней у полі пад Варшавай, якое называлася Воля (цяпер гэта ў межах горада, недзе ў раёне сучаснага Цэнтральнага чыгуначнага вакзала). Вынікі выбараў аб'яўляў прымас.

Пасля гэтага адбываўся каранацыйны сойм, які заўсёды праходзіў у Кракаве. Каранаваў караля прымас. Пасля каранацыі кароль прыступаў да выканання сваіх абавязкаў.

Сойм Рэчы Паспалітай быў двухпалатны. Ён складаўся з Сената і Пасольскай ізбы. Вышэйшай палатай з'яўляўся Сенат. Сюды ўваходзілі іерархі каталіцкай царквы (біскупы і арцыбіскупы), ваяводы і кашталяны ад кожнага ваяводства як Польскага каралеўства, так і ВКЛ, міністры абедзвюх дзяржаў (маршалкі надворныя, канцлеры, падканцлеры, падскарбіі і г. д.). Колькасць сенатараў даходзіла да 150 чалавек. Прызначаў сенатараў кароль, які быў старшынёй Сената.

У склад Пасольскай ізбы ўваходзілі земскія паслы, якіх выбірала шляхта на павятовых сойміках. Такія соймікі склікаліся за 6 тыдняў да адкрыцця сойма Рэчы Паспалітай. Кожны павет як Польскага каралеўства, так і ВКЛ выбіраў па два земскіх паслы. Агульная колькасць дэпутатаў Пасольскай ізбы перавышала 200 асоб. Вальны (г. зн. агульны) сойм Рэчы Паспалітай праходзіў кожныя 2 гады ў Варшаве і працягваўся 6 тыдняў. У 1673 г. была прынята пастанова, каб кожны трэці сойм Рэчы Паспалітай праходзіў у Гародні. Дарэчы, апошні сойм Рэчы Паспалітай праходзіў у Гародні ў 1793 г. Гэтай неардынарнай гістарычнай падзеі прысвечаны раман выдатнага польскага пісьменніка, лаўрэата Нобелеўскай прэміі Уладзіслава Станіслава Рэйманта (1867–1925) «Апошні сойм Рэчы Паспалітай» (Адно з выданняў рамана на рускай мове выйшла ў Мінску ў 1994 г.).

Аднак, нягледзячы на значнае збліжэнне палітычных сістэм ВКЛ і Польскага каралеўства і пасля Люблінскай уніі захавалася значная дзяржаўная самастойнасць ВКЛ. Існавалі асобны ўрад, адміністрацыя, казна і войска. У грамадскай свядомасці заставалася папулярнай ідэя палітычнай адасобленасці ВКЛ. Насуперак рашэнням Люблінскага сойма 1569 г. перад вальным соймам для выпрацоўкі агульнай лініі сенатары і паслы ВКЛ збіраліся звычайна на *Генеральны соймік* у Ваўкавыску. Пазней месца яго правядзення было перанесена ў горад Слонім.

Пастановы соймаў Рэчы Паспалітай пасля 1569 г. былі абавязковымі як для Польскага каралеўства, так і для ВКЛ, што адзначалася ў тэксце пастаноў – «распаўсюджваецца на ВКЛ». Але часам сойм прымаў пастановы выключна для ВКЛ. У выпадку незадаволенасці пастановамі вальнага сойма Рэчы Паспалітай альбо вострай дзяржаўнай неабходнасці склікаўся

*Генеральны літоўскі з'езд*, які называўся таксама *Віленскай канфедэрацыяй*. На з'езд прыбывалі абраныя на павятовых сойміках сенатары і паслы ВКЛ, якія абмяркоўвалі і прымалі рашэнні адносна падаткаў і войска. Усё гэта супярэчыла тэксту Люблінскай уніі і адначасова з'яўлялася пацвярджэннем самастойнасці ВКЛ.

Вялікую ролю ў захаванні адасобленасці ВКЛ ад Польскага каралеўства адыграла стварэнне Трыбунала ВКЛ, а таксама прыняцце III Статута ВКЛ 1588 г. Галоўная заслуга ў гэтым належыць Льву Сапегу – віднаму дзяржаўнаму дзеячу ВКЛ, прафесійнаму юрысту, дыпламату, палітыку, выдатнаму прадстаўніку палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI ст.

Л. Сапега паходзіў са знатнага магнацка-княжацкага роду, другога па магутнасці ў ВКЛ пасля Радзівілаў. На працягу XV–XVIII стст. яго прадстаўнікі займалі важныя дзяржаўныя пасады ў ВКЛ, адзначаліся высакароднымі грамадзянскімі дабрачыннасцямі, але ў найбольшай ступені яны былі ўласцівы Льву Сапегу. Л. Сапега нарадзіўся 4 красавіка 1557 г. недалека ад Віцебска ў радавым маёнтку Астроўна Віцебскага ваяводства. Да нашых дзён ніякіх памятак на месцы нараджэння Л. Сапегі не захавалася. Вось што пісаў Ю. Віцьбіч пра Астроўна, якое ён наведаў напярэдадні Вялікай Айчынай вайны: «Паблізу Віцебска, каля возера Астроўна, ляжыць пад тым жа назовам старадаўняе, але напоўзабытае ціхае мястэчка. Над вузкімі вулачкамі з сціплымі хатамі ўзвышаецца каменная вежа з гадзіннікам <…> Аднак ужо ніякага следу не засталося ад дарагога для нас будынку, у якім у 1557 г. нарадзіўся «Бацька Бацькаўшчыны», найвялікшы наш дзяржаўны муж – Леў Сапега. Мне усё ж пашанцавала знайсці на прыгожым узгорку над возерам, паводле старых планаў і народных паданняў, тое месца, дзе ён знаходзіўся…» (Цяпер вёска Астроўна – гэта Бешанковіцкі раён Віцебскай вобласці).

У сямігадовым узросце бацькі паслалі яго (так тады было прынята) для атрымання належнага, адпаведнага яго паходжанню, шляхетнага выхавання, у Нясвіж, дзе некалькі гадоў ён жыў пры двары Мікалая Радзівіла Чорнага. Потым, разам з сынамі М. Радзівіла, Л. Сапега выехаў на вучобу за мяжу, у Германію, у Лейпцыгскі ўніверсітэт, дзе на працягу некалькіх гадоў слухаў лекцыі на юрыдычным факультэце мясцовага ўніверсітэта. У час знаходжання ў Германіі малады Л. Сапега захапіўся рэфармацыйнымі ідэямі і перайшоў з праваслаўя ў пратэстантызм.

Пасля вяртання на радзіму пачалася бліскучая дзяржаўная кар'ера Л. Сапегі, якая завяршылася заняццем самых прэстыжных дзяржаўных пасад у ВКЛ. У 1581–1585 гг. – ён пісар вялікі літоўскі, у 1585–1589 гг. – падканцлер літоўскі, у 1589–1623 гг. – канцлер вялікі літоўскі і з 1623 г. – гетман ВКЛ. Памёр Л. Сапега 7 ліпеня 1633 г. на 77 годзе жыцця і быў пахаваны ў касцёле св. Міхаіла ў Вільні.

Л. Сапегу належыць заслуга рэфармавання судаўладкавання ВКЛ, стварэння ў 1581 г. *Трыбунала ВКЛ* – саслоўнага шляхецкага суда другой і апошняй інстанцыі, які праіснаваў да канца XVIII ст. Суддзямі Трыбунала з'яўляліся прадстаўнікі шляхты, якія выбіраліся на павятовых сойміках тэрмінам на адзін год па аднаму, альбо па два ад ваяводства (альбо павета). Апрача шляхты, ў склад Трыбунала ўваходзілі таксама прадстаўнікі духавенства. На чале Трыбунала стаяў выбіраемы з ліку суддзяў маршалак. Духавенства мела свайго прэзідэнта. Да 1599 г. Трыбунал засядаў толькі ў Вільні, а з 1599 г. яго паседжанні адбываліся таксама па чарзе ў Навагародку і Мінску. У 1775 г. паседжанні Трыбунала ВКЛ былі перанесены з Мінска ў Гродна. Трыбунал разглядаў апеляцыі па крымінальных і грамадзянскіх рашэннях земскіх, гродскіх і падкаморскіх судоў. Справы разглядаліся канчаткова. У выпадку недахопу неабходнай большасці галасоў (суд складаўся з 46 суддзяў-дэпутатаў) справа перадавалася ў соймавы суд.

Адна з самых яркіх і велічных старонак у біяграфіі Л. Сапегі – удзел у рабоце камісіі па стварэнні *Статута ВКЛ 1588 г.*, яго прынящці і выданні. Неабходнасць перагляду Статута ВКЛ 1566 г. паўстала ўжо падчас Люблінскага сойма 1569 г. З гэтай мэтай Люблінскі сойм стварыў Статутавую камісію, якая распачала працу па пераглядзе зместу Статута 1566 г. На заключным этапе значную ролю ў распрацоўцы праекта Статута адыграў Л. Сапега, які ўзначаліў Статутавую камісію. У 1584 г. праект Статута быў адобраны на Генеральным з'ездзе беларуска-літоўскай шляхты ў Ваўкавыску, пасля чаго Стэфан Баторый паабяцаў разгледзець яго на бліжэйшым сойме і канфірмаваць (г. зн. зацвердзіць). Нечаканая смерць С. Баторыя адцягнула гэтую працэдуру да часу абрання новага караля.

У 1587 г. праект Статута ВКЛ разглядаўся на элекцыйным сойме ў Варшаве, а на пачатку наступнага 1588 г. быў зацверджаны на каранацыйным сойме ў Кракаве. Пасля гэтага 28 студзеня 1588 г. Статут быў канфірмаваны прывілеем новаабранага караля Рэчы Паспалітай – Жыгімонта III Вазы. Названы прывілей быў надрукаваны разам са Статутам 1588 г.

Адначасова з канфірмацыяй Л. Сапега атрымаў ад караля прывілей на выданне Статута[1]. Прывілей даваў яму выключнае права Статут «пісьмом беларускім і польскім друкаваці і ў паветы рассылаці». Пасля гэтага ў віленскай друкарні братоў Мамонічаў (на сродкі Л. Сапегі) распачалося друкаванне Статута на старабеларускай мове. Яно было скончана ў канцы 1588 (альбо ў самым пачатку 1589) года. Пры жыцці Л. Сапегі Статут выдаваўся яшчэ тры разы – у 1592 і ў 1594 гг. (як і ў 1588 г.) – на старабе-

[1] Гэты Прывілей, напісаны на лацінскай мове, таксама быў надрукаваны разам са зместам Статута на яго першай старонцы. На жаль, сучасныя выдаўцы Статута (Мінск, 1988) чамусьці не палічылі патрэбным надрукаваць гэты Прывілей на мове арыгінала.

ларускай мове і ў 1614 г. ў перакладзе на польскую мову. Тыраж выданняў дасягнуў 4 000 экземпляраў, што нават для нашых дзён з'яўляецца значнай лічбай. У 1988 г. ў сувязі з 400-годдзем з моманту прыняцця Статута 1588 г. выдавецтва Беларускай Савецкай Энцыклапедыі перавыдала гэты выдатны помнік юрыдычнай думкі, і цяпер ён шырока даступны для вывучэння як студэнтам-прававедам, так і студэнтам іншых гуманітарных спецыяльнасцей.

Статут ВКЛ 1588 г. юрыдычна замацаваў эвалюцыю палітычнага ладу ВКЛ ад магнацкай алігархіі да шляхецкай дэмакратыі, дамінуючую ролю шляхты ў дзяржаўным жыцці, а таксама адносіны, якія склаліся паміж ВКЛ і Каралеўствам Польскім пасля Люблінскай уніі. Ён адлюстраваў значную дзяржаўна-палітычную *самастойнасць* Княства, адасобленасць яго тэрыторыі, дзяржаўных устаноў, арміі, заканадаўства, суда, казны, дзяржаўнай беларускай мовы ад Каралеўства Польскага, што было дасягнута дзякуючы ўсебаковым намаганням Льва Сапегі. Важна адзначыць, што арыгінал Статута, менавіта той, які разглядаўся і быў зацверджаны соймам і каралём, напісаны на старабеларускай мове. Менавіта гэты беларускі тэкст, выданы ў канцы 1588 г. (альбо ў пачатку 1589 г.), і лічыўся на працягу ўсяго перыяду дзеяння Статута арыгіналам закона. Польскамоўныя выданні, якія пачалі друкавацца з 1614 г. такога значэння не мелі і насілі прыватны (інфармацыйны) характар. Менавіта таму ў «Звароце» да ўсіх саслоўяў ВКЛ, змешчаным у якасці прадмовы да гэтага выдатнага помніка нацыянальнай прававой думкі Л. Сапега з гонарам адзначаў: «...Не обчым (г. зн. не чужым. – *В. Ш.*) якім языком, але сваім уласным (г. зн. беларускім. – *В. Ш.*) права пісаныя маем».

Галоўнымі крыніцамі для вывучэння палітычных і прававых поглядаў Л. Сапегі з'яўляюцца: «*Прысвячэнне*» выдання Статута каралю польскаму і Вялікаму князю літоўскаму – Жыгімонту III Вазе; «*Зварот*» да ўсіх саслоўяў (г. зн. грамадзян) ВКЛ; сам «*Статут 1588*», на змест якога глыбока паўплывалі і ў якім адлюстраваліся палітыка-прававыя погляды Л. Сапегі; *эпісталярная спадчына* Л. Сапегі (перш за ўсё ліст Льва Сапегі да Іасафата Кунцэвіча, напісаны ў 1622 г.) [Цыт. па: 2, с. 93–109]; а таксама самастойная праца Л. Сапегі «*Выклад трыбунальскіх праў*» (1616).

У першую чаргу неабходна звярнуцца да вывучэння «Прысвячэння» і «Звароту», якія па сутнасці справы, увенчваюць стройную архітэктоніку велічнага будынку Статута 1588 г. – гэтага выдатнага помніка нацыянальнай юрыдычнай думкі. Па змесце іх можна разглядаць як невялікія, напісаныя ў духу лепшых гуманістычных традыцый эпохі Адраджэння палітычныя трактаты, у якіх выкладаецца *канцэпцыя прававой дзяржавы.*

Погляды Л. Сапегі на дзяржаву і права склаліся пад уплывам вучэнняў палітычных мысліцеляў і дзяржаўных дзеячоў антычнасці. Як рэнесансны

мысліцель-гуманіст, ён прытрымліваўся арыстоцелеўска-цыцэронаўскай канцэпцыі паходжання і прызначэння дзяржавы. Л. Сапега лічыў, што дзяржава паўстала натуральным шляхам і прызначаецца для дасягнення магчыма лепшага жыцця. Яна засноўваецца на прынцыпах унутранага адзінства, цэнтралізму, правапарадку і законнасці.

Цэнтральнай катэгорыяй філасофіі права Л. Сапегі з'яўлялася катэгорыя *свабоды*. «Мудрацы ўсіх вякоў лічылі, што ў кожнай дзяржаве прыстойнаму чалавеку нічога не можа быць даражэй за свабоду», – менавіта такімі словамі пачынае Л. Сапега свой слынны «Зварот» да ўсіх саслоўяў ВКЛ. Сутнасць свабоды складаюць неадчужальныя правы чалавека – уласнасці і асабістай недатыкальнасці. «А для прыстойнага чалавека няма большай асалоды, – пісаў Л. Сапега, – як жыць у сваёй айчыне ў поўнай бяспецы, ні з кім не біцца і не сварыцца і каб ніхто яго не зняславіў ці пакалечыў або пакваліўся на яго дабро».

Менавіта для абароны грамадзянскіх свабод і існуе *права*, якое Л. Сапега разглядаў як сапраўднае праяўленне розуму чалавека, «вартавога ўсеагульнай свабоды». «Галоўнай мэтай законаў ва ўсім свеце, – адзначаў Л. Сапега, – з'яўляецца падтрыманне ў грамадстве такога становішча, каб кожны мог захоўваць у непарушнасці добрае імя, здароўе і маёмасць і не цярпець з боку іншых ніякай шкоды. У гэтым і заключаецца наша свабода, якой мы ганарымся перад іншымі хрысціянскімі народамі». Права павінна забяспечыць дзяржаве ўнутраны парадак, стабільнае і ўстойлівае развіццё, сацыяльны мір. Таму жыццё ў адпаведнасці з законамі – абавязковая ўмова існавання дзяржавы. Л. Сапега любіў паўтараць і ўжываць у сваіх творах крылаты афарызм Цыцэрона: «*Естесмо невольниками прав для того, абысь мы вольности уживати могли*». У перакладзе на сучасную беларускую мову гэта можа гучаць так: «Мы павінны з'яўляцца рабамі законаў для таго, каб мець магчымасць карыстацца свабодай». Гэта катэгарычны імператыў грамадства. Толькі павага да права дае магчымасць быць сапраўды свабоднымі. «А пра тое ён, вялікі і паважаны філосаф грэчаскі Арыстоцель сказаў, – спасылаўся Л. Сапега на аўтарытэт другога выдатнага мысліцеля антычнасці, – што там… дзе права альбо статут пануе, там сам Бог усім кіруе».

Кожны чалавек павінен ведаць межы сваёй свабоды, а для гэтага, на думку Л. Сапегі, неабходна вывучаць законы. «Кожнаму прыстойнаму чалавеку належыць іх ведаць, і будучы дасведчаным у іх, стрымліваць сябе ў сваіх учынках, дзейнічаць у адпаведнасці з пісаным законам і нікога не крыўдзіць, а калі б сам кім быў пакрыўджаны, ведаў, дзе абарону і лекі ад крыўды сваёй шукаць». Больш таго, «кожны жыхар заслугоўвае ганьбавання, калі сваімі вольнасцямі пахваляецца, а карыстацца законам і разумець яго як асабістую засцярогу не жадае».

Л. Сапега лічыў, што закон павінен быць аднолькавым і абавязковым для ўсіх станаў. Разам з тым, ён павінен быць накіраваны супраць асобных

правапарушальнікаў. Закон – гэта «аброць і цуглі, каб стрымліваць кожнага нахабніка ад усялякага гвалту і самавольства і не даваць яму магчымасці здзекавацца над слабейшымі і бяднейшымі ды прыгнятаць іх». Калі ў грамадстве, заўважаў Л. Сапега, адсутнічае павага да права, пануе свавольства і беззаконнасць, яно не можа лічыцца чалавечым і справядлівым, а з'яўляецца воўчай зграяй. Пры гэтым ён ізноў спасылаўся на аўтарытэт Арыстоцеля, на словы апошняга пра тое, што «там дзікі звер пануе, дзе чалавек выкарыстоўвае ўладу паводле асабістага меркавання». Права павінна не дапусціць выкарыстання дзяржаўнай улады ў карысных мэтах правіцеля, прадухіліць выраджэнне манархіі ў тыранію і такім чынам абараніць падданых ад злоўжывання вярхоўнай улады. Тыранію Л. Сапега лічыў несумяшчальнай з патрабаваннямі чалавечага розуму і справядлівасці.

Усё гэта дае падставу разглядаць Л. Сапегу як прыхільніка ідэі прававой дзяржавы. Ужо сучаснікі добра разумелі значэнне дзейнасці Льва Сапегі. Яны называлі яго «*літоўскім Салонам*». Зразумела, што прыметнік «літоўскі» мае не этнаграфічны, а дзяржаўна-тэрытарыяльны сэнс і азначае прыналежнасць да ВКЛ.

Наступныя пакаленні таксама высока цанілі дзейнасць і духоўную спадчыну Л. Сапегі. У прыватнасці, адзін са стваральнікаў Канстытуцыі 3 мая 1791 г., выдатны польскі асветнік XVIII ст. Гуга Калантай (1750–1812), выступаючы на сойме Рэчы Паспалітай 28 чэрвеня 1791 г. у сваёй прамове сказаў: «Гаворачы аб "Літоўскім статуце", я маю на ўвазе тую кнігу, пра якую нельга ўспамінаць без вялікага захаплення. Гэты твор у сваёй сукупнасці (г. зн. разам з "Прысвячэннем" і "Зваротам". – *В. Ш.*) прынёс бессмяротную славу Льву Сапегу. "Літоўскі статут" робіць гонар чалавечаму розуму… "Літоўскі статут" складзены настолькі разумна, што яго можна лічыць самай дасканалай кнігай законаў ва ўсёй Еўропе» [Цыт. па: 1, с. 347].

Пацвярджэннем слоў Г. Калантая з'яўляецца тое, што Статут 1588 г. дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі і Літвы больш за 250 гадоў і быў адменены Мікалаем I толькі пасля лістападаўскага паўстання 1830–1831 гг. Такім чынам, ён дзейнічаў некалькі дзесяткаў гадоў нават пасля таго, як беларускія землі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай у 1772, 1793, 1795 гг. паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй былі інкарпараваны ў склад Расійскай імперыі. У 1832 г. дзейнасць Статута была спынена на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў, а ў 1840 г. – на тэрыторыі Гродзенскай, Мінскай і Віленскай губерняў.

Асабліва высока цанілі дзейнасць Л. Сапегі лідары беларускага нацыянальнага Адраджэння, якое пачалося ў канцы XIX – пачатку XX ст. Тэарэтыкі і лідары беларускага нацыянальна-вызваленчага руху звярталіся да зместу Статута і духоўнай спадчыны вялікага канцлера, хоць часам не ўжывалі ні назвы Статута, ні прозвішча яго галоўнага стваральніка. Перш

за ўсё, яны звярталі ўвагу на *беларускую мову* Статута, паколькі апошняя да таго часу даўно ўжо не толькі перастала гучаць ў якасці дзяржаўнай, але ператварылася ў маргінальную з'яву грамадскага жыцця. Вось што, напрыклад, пісаў выдатны беларускі паэт другой паловы XIX ст. Ф. Багушэвіч (1840–1900) у прадмове да «Дудкі беларускай»: «Чытаў я ці мала старых папераў па дзвесце, па трыста гадоў таму пісаных у нашай зямлі і пісаных вялікімі панамі, а *нашай мовай чысцюсенькай* (выдзелена мной. – *В. Ш.*), як бы вот цяпер пісалася».

Сярод тых «старых папераў», якія чытаў Ф. Багушэвіч (заўважым, адвакат па прафесіі) быў, безумоўна, і тэкст Статута 1588 г. Да такой высновы падводзяць наступныя факты. «Дудка беларуская» выйшла ў Кракаве ў 1891 г., III Статут у 1588 г. (альбо ў пачатку 1589 г.) у Вільні. Калі параўнаць даты выхаду ў свет твора Ф. Багушэвіча і Статута, то атрымаецца, што іх аддзяляе больш менш каля 300 гадоў, на што і звярнуў увагу Ф. Багушэвіч. Зварот Багушэвіча да спадчыны «вялікіх паноў» (не ў сэнсе багацця, а ў сэнсе значэння дзяржаўнай дзейнасці), сярод якіх быў і Л. Сапега, спасылкі на мову помнікаў беларускай культуры XVI–XVII стст., у тым ліку і Статута ВКЛ 1588 г. ужыты для таго, каб паказаць, што «*мова нашая ёсць такая ж людская і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая*».

Да аналізу жыццевага шляху, дзяржаўнай дзейнасці і тэарэтычнай спадчыны Льва Сапегі звярталіся браты Іван і Антон Луцкевічы, а таксама публіцысты «Нашай Нівы» і іншыя. Такім чынам, спадчына Л. Сапегі стала адной з крыніц беларускага нацыянальнага адраджэння у канцы XIX–пачатку XX ст. Даследаванне гэтай праблемы з'яўляецца актуальнай задачай гісторыкаў дзяржавы і права Беларусі.

Беларускі паэт XVI ст. Андрэй Рымша (1550–1599) у вершы, надрукаваным разам з тэкстам Статута, геніяльна прадказаў адносіны будучых пакаленняў да асобы Льва Сапегі. З рэдкім дарам прароцтва ён пісаў:

Жывіце ж, Сапегі, усе многія лета
Ваша слава слыць будзе, пакуль не стане света…

Паэт не памыліўся ў сваім прадбачанні. На Беларусі заўсёды памяталі і будуць памятаць пра выдатнага дзяржаўнага дзеяча, заканадаўца і палітычнага мысліцеля, дэвізам жыцця для якога быў прынцып, сфармуляваны яшчэ рымскімі юрыстамі «*Salus publica, suprema lex*» («Блага грамадства – найвышэйшы закон»).

Да аналізу жыццёвага шляху, дзяржаўнай дзейнасці і духоўнай спадчыны Льва Сапегі звяртаюцца і сучасныя беларускія даследчыкі. Пра гэта сведчыць, у прыватнасці, перавыданне Статута 1588 г. ў Мінску ў 1988 г., а таксама шэраг змястоўных публікацый.

## Літаратура

1. Избранные произведения прогрессивных польских мыслителей: в 3 т. / подбор и ред. текстов, вступ. ст. и примеч. И. С. Миллера, И. С. Нарского.– М.: Госполитиздат, 1956. – Т. 1. – 784 с.

2. Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский, М. В. Кашуба, С. А. Подокшин [и др.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 319 с.